Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоўская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поўдня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права направляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаўкай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й страп. 1 руб
на апошнім—30 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 6. Менск. Пятніца 29 сакавіка 1918 г. Год I.

Менск 29/III.

На Заходзе зямля сатрасаецца да глыбін і ад неба да абхаксу ад страшнаго бою, гдзе мечы гаворуць сваё астатняе слова. Шалікі вагі гісторыі павінны схіліцца ці на той, ці на другі бок. Ад гэтаго і гісторыя усіх дзяржаў і народаў усяго сьвету можа пайсьці на двум розным дарогам, зусім ніспадзяваным. Калі сонца міра і шчасьця асьвеце змучаные народы якое іх будзе тагды палажэнне?

Гэтае ніпэўнасьць чуецца у паветры скрозь.

Самы вялікі розум ні можа ор'ентавацца у тых новых выпадках, каторые, як горы, абваліваюцца на нас.

На скорую руку аб'яўляюцца новыя рэспублікі: Украіна, Беларусь, Каўказ і т. д.. Гэтыя рэспублікі робяцца пад знакам злучэння у адну адзінасьць кожнай нацыі. Інстынкт самасахранення ёсьць у кожнаго жывога арганізму, у нацыянальным—так сама.

Усе старые сувязкі, зьвязываючые у адну граматаду, як у нас,—у расійскую імпэрыю—разарваліся. Кожная нацыя асталася, як у дзікім начным полі, адна. Асталася адна раптам, у ніспадзеўкі, ні прыгатаваная да гэтаго, да жыцця, гдзе трэба правацца сваёй уласной воляй, сваім уласным розумам.

Трэба яшчэ сабрацца, зрабіць, так скажаць, нацыянальную «пераклічку». Пераклічку яшчэ ні скончылі, як напрыклад, мы беларусы: нашы зьезды разганяліся па ўрабоці.

А тут жыцьцё вымагае ужо рашаць адразу, калі ні прайшлі яшчэ сажэння, задачы па высшэй гадударственай матэматыцы.

Што ж рабіць? Ясная рэч, што кожны нацыянальны і дзяржаўны арганізм складываецца доўгіе доўгіе годы. На што трэба стулецця, таго ні зробіш у гадзіну. Патрэбны формы жыцця, але адны формы пустыя ні могуць быць, трэба іх чымсь запоўніць. Пустая бочка гудзіць, а поўная маўчыць. Тахое віно, каторым можна наліць формы палітычные, ёсьць праца над разьвіццем усіх старон культуры народу: духоўнай, матэрыяльнай, маральнай. Патрэбны вялізные кадры нацыянальнай інтэлігэнцыі, каторая возьме на сябе усю гэтую творчую работу. Трэба яе сабраць і зарганізаваць у стройную сыстэму. Ніхай часьць палітыкаў займецца палітыкай, але ні трэба, каб усе чыста мучылі сябе голымі палітычнымі лёзунгамі.

* * *

Інтэлігентны голад.

Апрач керасінаваго, жалезнаго голаду і др. чуецца і на Літве, і на Украіні, і на Беларусі ніхват інтэлегэнтных сіл.

За 4 годы вайны сталі пустые універсытэты, сэмінарыі. Маладзеж кінула іх і пайшла на вайну, кожны ведаіць, што годы вайны трэба выкрасьліць с свайго жыцця, як страчэные.

Над гэтым трэба падумаць: трэба, каб беларусы ахвяравалі астатнюю капейку на стварэнне розных учэльняў, гдзе у зацішы клясоў і аудыторый будуць укладаць у галовы і сэрцы маладзежы зерні знання, гуманізму вялікіх умоў геніяў людзкіх, каторые як сонцо усхадзячае, зганяюць, як туман, усе нізкае, ніпраўдзівае, злостнае з адзічалых і пакінутых душаў.

Устаўная Грамата Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

Год назад народы Беларусі разам з народамі Расіі скінулі ярмо Расійскаго царызму, які найцяжэй прыціснуў быў Беларусь; ні пытаючыся народу, ён кінуў наш край у пажар вайны, якая чыста зруйнавала гарады і вёскі беларускіе. Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднаго краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расійскіе цары на наш вольны і нізалежны край. Ад гэтаго часу Беларуская Народная Рэспубліка Абвешчаецца Нізалежнай і Вольнай Дзяржавай. Самі народы Беларусі, ў асобі свайго Устаноўчаго Сойму, пастановяць аб будучых дзяржаўных зьвязях Беларусі.

На моцы гэтаго трацяць сілу ўсе старыя дзяржаўныя зьвязі, якія далі магчымасьць чужому ураду падпісаць і за Беларусь трактат ў Берэсьці, што забівае на сьмерць беларускі народ, дзелючы зямлю яго на часткі. На моцы гэтаго урад Беларускай Народнай Рэспублікі мае увайсьці ў адносіны з зацікаўленымі старонамі, прапануючы ім перагледзіць тую часьціну Берэсьцейскаго трактату, якая датычыць Беларусі, і надпісаць міравую умову з усімі ваяваўшымі дзяржавамі.

Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць ўсе землі, дзе жыве і мае лічбенную неравагу беларускі народ, а ласьне: Магілёўшчыну, беларускія часьці Міншчыны, Гродзеншчыны (з Гроднай, Беластокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігоўшчыны і сумежныя часьці суседніх губерняў, заселёныя беларусамі.

Беларуская Народная Рэспубліка падцьверджывае усе тыя правы і вольнасьці грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаны Устаўной Граматай ад 9 сакавіка 1918 г.

Абвешчаючы аб нізалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, Рада яе пакладае свае надзеі на тое, што ўсе любячые волю народы дапамогуць беларускаму народу ў поўнай меры здейсьніць яго палітычна-дзяржаўные ідэалы.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі.

Дана у Менску-Беларускім 24 сакавіка 1918 году.

З Украіны.

Гандлёвы абмен. Аўстрыйская гандлёвая далегацыя пачала 22 сакавіка г.г. у Кіеві перагаворы з дзержаўнай камісіяй па тавараабмене паміж Украінай і цэнтральнымі дзержавамі. Дзержаўная камісія згодзілася на вываз з Украіны 200,000 пуд. насення, главным чынам у Галіцыю, Букавіну. Аўстрыйская делегацыя у замен згадзілася на экстэрную дастаўку на Украіну газы, бэнзыну і нафты. Нямецкая гандлёвая дэлегацыя згадзілася на пасьпешную дастаўку на Украіну камен. вуглю і коксу. Далей дзяржаўная камісія і аўстрыйская з нямецкай гандлёвыя дэлегацыі павінны абсудзіць якім спосабам будуць устанаўлівацца цэны на прадукты абмену.

З Малой Рады. 22 сакавіка у Малой Радзе увесь дзень быў заняты інтэрпэляцыямі с прычыны нізаконных пастуПкаў украінскай мейсцовай і ваеннай аустрыйскай улады у Луцку, Белай царкве, Казаціне, Фастове, Жытоміру, Камянец-Падольску і інш. гарадох. Нізаконнасьці выліваліся у формі забаронаў грамадзянскіх вольнасьцяў, пасьпешных арэштаў, накладання контрыбуцыяў [украінскаю ўладаю] і г. д. Інтэрпэляцыі унесьлі габр. об. раб. соц. партыя і Бунд. Самі інтэрпэлянты, а з імі рэсійскія с.-р. і с.-д. падтрымоўвалі пасьпешнасьць запытанняў, а украінскія с.-р. с.-д. і соц.-фэдэралісты стаялі за перадачу запытанняў у камісію с 7 чалавек. Галасаваннем прынята здача ў камісію.

Одгукі нямецкаго наступлення на Заходзе. Абстрэл Парыжу.

Паводлуг «Woss. Ztg.» парыжскі корэспандэнт аднэй з лёнданскіх газэтаў паведамляе, што у часе абстрэлу фортэцыі, Парыж выглядаў так сама, як у той дзень, калі народ уцёк у Бордо у жніўню 1914 г.

У працягу 9-ці гадзіннаго, бэзмала абстрэлу Парыжу цяжкай нямецкай артылерыяй, вялізная сталіца як бы вымерла. Роўна у $7^{1}/_{2}$ гадзін і рана у суботу моцная раха устрасянула паветрам.

Усе думалі, што гэта новая катастрофа у артылерыйскім складзе. Выбухі пачалі паўтарацца праз кажныя 20 мінут. Да другой гадзіны дня усе думалі, што гэта налет паветранаго флоту.

У ваенным міністэрстві так сама ні чого ня ведалі, пакуль на вуліцы гораду ні знайшлі кавалак гранатнай гільзы.

Да якого стопню абстрэл з'явіуся ніспадзеваным для французскаго ураду, паказывае тое, што у 10 гадз. зрана за граніцу было выслана паведамленне аб паветраным нападзе на Парыж. Нямецкія гранаты падалі акуратна праз 20 мінут. Апошні стрэл пачуўся у 3 гадзіны 20 мін. пасля поудня. Ва усіх установах і рэдакцыях Парыжу панавала замешанне.

Тэлеграфны дрот Парыж—Жэнэва ні працаваў амаль ні увесь дзень.

Рэстарацыі пазачыняліся. Дзеці, работнікі і чыноунікі хаваліся у склепох. У 5 гадз. пачуліся сырэны, паведамляючыя аб скапчэнні абстрэлу, але у 9 гадз. пачуліся новыя стрэлы, бо паведамілі аб паветраным налёце. Экспрэсы, адходзячые на поудзень, перапоўнены уцекачамі.

Павэдлуг «Berlin. Lokalan.» газэта «Iornal» піша, што у Парыж і яго аколіцы трафіла 24 стрэлы. Нямецкіе лётнікі шмат дапамагаюць артылерыі.

Французскія і ангельскія газэты памечаюць усякія дагадкі аб цудоўнай гармаце, с каторой вёўся абстрэл.

ПАРЫЖ (25 г. м. «Havas)» Абстрэл ПарыжУ з дальнабойнай гарматы узнавіуся у панядзелак у 6 г. дз. 50 мін. зрана.

У Польшчы.

Пэўнымі Кандыдатамі будучаго габінэту міністраў называюць: Стачкоўскаго, Яна Стэцкаго, Станіслава Дзержбіцкаго, Громана (з Лодзі) і кн. Януша Радзівіла, як будучаго дырэктара дэпартамэнту паліцыі.

За віцэдырэктара гэтаго дэпартамэнту мае быць хто небудзь з урадоўцаў з дыпломацыі, можа быць, адзін з аўстрыйскіх консулаў.

Мажліва, што кандыдатам будзе хто небудзь с п. п. Гельлёр, Окэнцкі, альбо Страшэўскі.

Шэфам аднаго з дэпартамэнтаў міністэрства унутр. спраў мае быць Усьцімоўскі.

Наскольки дагэтуль ведама Нарадовы Цэнтр ні прыймаецца пад увагу, пры утварэнню габінэта міністраў.

«Kurjer Polski» паведамляе, што рымска-каталіцкіе ўлады заняты цяпер зваротам сьвятыняў і нерухомых маетнасьцей адабраных некалі расійскай уладаю ад каталіцкаго касьцелу.

Весткі с краю.

З БАРЫСАВА Менск. губ.

Заняты нямецкім войскам Барысаў, знайходзіцца пад яго ахаронай і ўладай. Есьць два нямецкіх камэнданты,—у Нова-Барысаве і у Барысаве, с каторых перны выдае жыхаром пропускі у Менск і у Расію, а Барысоўскі—ведае грамадзкім жыцьцём павету.

Перад прыходам нямецкаго войска з'явіліся ў Барысаве польскіе легіоны, якія узяліся было мсьціцца над прэдстаўнікамі селян і па селянах за бальшэвіцкія прымусовыя «рэформы», ад каторых ні соладка прыходзілося і селянам, але с прыходам немцаў гэта скончылася, бо легіоны атправілі у Бабруйск, а усе іх распараджэння скасавалі.

У Барысаўскім павеце нямецкія ўласьці робяць рэквізыцыю на хлеб і інш. дабро, якое звозіцца у Барысаў.

Месцовым самапраўленнем арганізованы у Барысаве харчовы атдзел, каторы уладзіў выпечку хлеба для прадажы па бонавым кніжкам. Хлеб с харчовым земскіх крамаў прадаецца па 3 фун. на бонавую кніжку па 80 кап. за фунт. На рынку жытні хлеб прадаецца па бонавым кніжкам, так сама картофля—па 2 ф. на чалавека, па $12^1/_2$ кап. за фунт.

Селяне па таргу прадаюць картофлю на 7 рубл. за пуд, буракі так сама па 7 рубл. Малако салодкае 85 кап. кварта. Жывых і колатых сьвіней селяне не прывозяць, бо як кажуць, іх амаль ні асталося. Сала часамі прывозіцца і прадаецца па 7 рубл. за фунт. Іншых прадуктаў мала і цэны іх ністалые.

Шмат якія з селян скардзяцца, што ні будзя чым вясной засеяць. Насення німа. Усё выбраў фронт.

Школьныя справы ў павеці стаяць кепска. Школы амаль ня ўсе ні функцыянуюць. Пакуль ні устанавіўся нейкі новы парадак, шмат якіе с камітэтаў, створаные у часе іщчэ Керэнскаго ні знаюць што ім рабіць—зачыняцца, ці рабіць тую працу, для якой яны былі створаны законамі і дэкрэтамі рэвалюцыі.

Нятта ні пэўна пачуваюць сабе валасныя земствы—натрэбная і блізкая народу арганізацыя, каторую душылі большэвікі.

Фінансовыя справы павятоваго земства стаяць пакуль што кепска.

25/ш *Тутэйшы.*

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Земскім і гарадскім самауправам Беларускай народнай рэспублікі. Усебеларускі зьезд прэдстаунікоу земствау, гарадоу, зямельных і харчовых камітэтау, салдатау, селян, работнікау, коопэратывау, нацыянальных беларускіх радау і іншых арганізацыяу, які быу разагнаны Мінскаю большэвікоускаю уладаю, даручыу Радзе тварыць арганізацыю грамадзкіх сілау Берарусі, маючы на мэці яе адраджэнне і дзяржаунае будауніцтва.

Выпоуняючы волю Зьезду, агаласіушаго рэспубліканскі лад у рубяжох Беларусі и пастанавіушаго аб утварэнню краевоі улады, Спауняючы Камітэт Рады 20 Лютаго гэтаго року выбрау Народны Сэкрэтарыят Беларусі, як упоунаважнены орган народнай улады, а сьледам за тым 9 сакавіка ім была канстітуіравана Беларуская Народная Рэспубліка.

Вялікая адпаведальнасьць выпала на нас. Перад намі шлях доугі і цяжкі. Наша мэта—зьеднанне усіх частках Беларусі і зьдейсненне соцыяльных рэформау у інтарэсах працоунаго люду. Толькі пры арганізованасьці народау Беларусі, іх злучанасьці і пры актыунай народнай дапамозе нас ні страшаць ніякія труднасці. Мы клічам усе органы тутэйшаго земскага і гарадскога самаупраулення падзяліць з намі адпаведальнасьць і працу й падтрымаь нас маральна і матэрьяльна.

Будучы упэуняны, што нам, так як і нам дорагі інтарэсы нашаі бацькаушчыны Беларусі, яе воля й самаазначенне, мы чэкаем вашага хуткага й гарачага одгуку.

Старшыня Рады Усебеларускаго Зьезду **Я. Серада.**
Пісар **Т. Грыб.**
19 сакавіка 1918 г.
г. Мінск-Беларускі
Захароуская 43.

Начальнік службы руху Л.-Р. ж. д. інж. Крыжаноускі усіх інтэрасантау, якіе зьвертаюцца да яго, атпрауляе да начальніка свайго аддзелу—інж. Бэра. Трэба ведаць, што, інж. Бэр, як толькі прышлі у Менск немцы, стауся пры іх жалезнадарожным прэдстауніку—«савeтчыком» па устанауленю новых нормау быту для служачых, акладау, штатау і інш.,—як чалавек, ведаючы добра нямецкую мову і знаючы немцау іщчэ з Лібавы.

Дамінікансні касьцел, заснаваны 265 г. тому назад, і забраны пад казармы б. віленскім гэнерал-губэрнатарам Мурауевым у 1869 г. хутка стане зноу сьвятыняй для каталікоу. У мінулую нядзелю—24 сакавіка касьцел прывялі да парадку і высьвянцілі. Цяпер ідзе разборка трох казармных столяу; будуць зробляны сьценные малюнхі і фрэскі. Усе работы аплачываюцца з дабравольнай складчыны каталікоу. Найбольш працы дзеля усяго заходу гэтаго дакладае кс. Усас. Набажэнства пачаліся з мінулай нядзелі.

Вышэйшыя і ніжэйшыя пачатковыя школы пераходзюць цяпер пад загад гораду. Дырэкцыя народных вучылішч гэткім чынам ліквідуецца.

Вучыцялі вышэйшых пачатковыхъ школау, не атрымоуваючы ніякай пэнсіі с казначэйства, прымушаны былі цяжкім сваім палаженням, скарыстаць с часткі грошау, якія паступілі ад вучняу за навуку. Само сабой, што грошы гэтыя будуць зьвернуты, як толькі наладзіцца выплата пэнсіі.

Жалезн. дарожныя весткі. Прэдседацель цэнтральнага камітэту пры упрауленні Л.-Р. ж. д. інж, Россэтто выехау на Украіну дзеля перэгаворау з Радай аб тым, каб лінію Л.-Р. ж. д., начынаючы ад Гомялю, прылучыць да сеткі украінскіх дарог.

Нарада жалезнадарожнікау у упрауленні Л. Р. ж. д. адбылася 27 сакавіка разам с прэдстауніком ад нямецкаго загаду. Як выяснілося, немцы прызнаюць патрэбнай арганізацыяй толькі лінейных служачых, а не упрауленцау.

Упрауленцам даецца поуная воля: немцы іх ня думаюць ані увальняць, ані разлічаць—хочыш—заставайся, хочыш—выежджай у Расію—шукай там мейсца.

Гэткім парадкам справа безработных упрауленцау, каторые не атрымоўваюць ужо і харчоу, завісла у паветры.

Вывеска спіску кватэрантау пры кожным доме—мала дзе іщчэ зроблена, бо немцы на гэта не палажылі ніякаго тэрміну. Пры прозьвішчы кватэранта павінна быць паказана, чым ен займаецца.

Гэткіе спіскі, як мы чулі, маюць сваей мэтай прымусіць зарэгістравацца усіх ваеннаслужачых, а так сама не даць хавацца па кутох дэзэртырам, злодзеям і грабежцам.

Аддзел службы тэлеграфістау Л. Р. ж. д. аказауся самым спрытным. Іщчэ да прыходу немцау паны тэлеграфісты патрапілі паплаціць сабе пэнсіі, хапіушы грошы с палявога казначэйства, на шмат месяцау на перад. Расплатка была зробляна па «таварышчэскі»: іншым замест 300—350 руб. папала па 2000 і 2500 руб. у рукі.

Тымчасам, служачые другіх аддзелау, як рэмонту, службы руху, мэдыцынскі аддзел, камэрцыйны і інш.—жывуць галадаючы.

У рэдакцыю прыходзілі некатарые са служачых з заявай аб прапаушых нейкім спосабам 30000 р., якія у сваім часе павінны былі быць высланы для служачых на поудзень. Куды ж бы яны зацярушыліся??

Глаунаа аптэка пры ўпрауленні М. Р. ж. д. за апошніе часы саусім зьбяднела на лекарствы. Сур'езна хворым і лячыцца німа чым і у шпіталь свой німа магчымасьці трапіць, бо яго вывязлі годы два таму назад у Гомаль.

Мая песьня.

Як толькі ў сэрцы радасьць маю,
Надойдзе шчасная пара,—
Сваю я песьню зноў сьпеваю
Табе, сьвятлістая зара.
Надойдуць цяжкія гадзіны,
Маё агорне сэрцэ жаль,—
Пяю і ў гэтыя часіны,
Мой сумны сьпеў насецца ў [даль.

Прыдзе весна к нам чараўніца,
Настане сьветлы, дзіўны май—
Іспоў мне думка акрыліцца,—
Гучней пяю, мне ўторыць гай.
Зусім, здаецца, жікне горо,
Як толькі песьню запяю
Пра сьветлы край, пра сонцо, [зоры;
Снакой ідзе ў душу маю.
І мне чароўна так стаецца,
Я доўга ўсей душой пяю,
І песьня гучна ў даль нясецца.
Я ў песьні чую моц сваю.
Ляці-ж ты, песьня, ў высь, [далёка,
Над гэтай сумнаю зямлёй,
І сьветлы водгалас шырокай
Палійся хваляю—рэкой.
Нясіся ў высь, дзе на пра- [сторы
Нас цягнуць зоркі ў час жур- [бы,
Што моц даюць у цяжкім горы
І ў час жыцьцёвай барацьбы!

Я. Журба.

Рэдактар А. Прушынскі.
Выдавецтва Т-во «Заранка».

АБВЕСТКІ

С прычыны ліквідацыі аддзелаў Усерасійскаго Земскаго Саюзу асвабадзілася ад работы шмат рожных спэцыялістаў: дактары, ветэрынары, мэдыцынскіе фэльчары фармацэўты, аграномы, бухгалтары, счэтаводы, мэханікі-сесары, цеслі, шаўцы і інш.

Бюро па рэгістрацыі безработных пры камітэці злучаных работнікаў У. З. С. просіць усіх, кам здарыцца патрэба працоўнікоў, зьвертацца проста ў Бюро па рэгістрацыі безработных—Прэабражэнская вул. 26, хід з вуліцы, ад 10—2 гадз.

Аб'яўленне

29 Сакавіка г. г.,—у Вялікую Пятніцу 31 сакавіка і 1 красавіка г. г.—у дні Св. Уваскресення ў магазыны і гандлевыя завядзення павінны быць зачынены ад 10 гадзіны з рана за ўсе гэтыя дні.

Тэатры, кінематографы і іншыя увесялельныя завядзеньня забаронены. Распараджэнне гэта назыйходзіцца на нямецкіх ваенных.

За нівыпоўненне гэтаго прыказу буд. накладацца штраф на 200 марак с заменаю 6-ці тыднёвым арэштам.

Менск 26/III 1918 г.

Месцовая Комэндатура.

Друкарня Я. Грынблята.